БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
СТОЛІНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

Установа адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна"

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ: ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫНЯЙ
## (да 450-годдзя г. Століна)

## Частка 1

БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

СТОЛІНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ: ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫНЯЙ

## (да 450-годдзя г. Століна)

*Зборнік матэрыялаў*
*міжнароднай навуковай канферэнцыі*
*28–29 верасня 2005 года*

*У дзвюх частках*

**Частка 1**

БрДУ імя А.С. Пушкіна
2006

УДК 930.1 (476) (07)
ББК 63.3 (4Беи)
Г-46

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам
установы адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна»*

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар **А.А. Гарбацкі**
доктар філалагічных навук, прафесар **В.І. Сянкевіч**

*Рэдакцыйная калегія:*
**А.М.Вабішчэвіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**Ул.А.Сенькавец**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**А.М.Свірыд**, кандыдат гістарычных навук
**Г.М. Ішчанка**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Рэдакцыйная калегія выказвае падзяку начальніку ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама А.С. Рагачуку, а таксама старшыні Столінскага райвыканкама А. А. Дзямко за падтрымку выдання зборніка.

Г-46 **Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй (да 450-годдзя г. Століна)**: зборнік матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі, Столін, 28–29 верасня 2005 г. У 2 ч. Ч. 1/Брэсц. абл. выкан. кам., Століні раён. выкан. кам.; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; [рэдкал.: А. М. Вабішчэвіч, Ул. А. Сенькавец, А. М. Свірыд, Г. М. Ішчанка]. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2006. – 352 с.

ISBN 985-473-209-6 (ч. 1)
ISBN 985-473-208-8

У зборнік уключаны даклады і паведамленні міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў г. Століне 28–29 верасня 2005 года, а таксама архіўныя дакументы па гісторыі горада. Арганізатарамі канферэнцыі з'яўляліся ўпраўленне культуры Брэсцкага аблвыканкама, Столінскі райвыканкам, кафедра гісторыі культуры і рэлігіі, кафедра методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства БрДУ імя А.С. Пушкіна.

Выданне адрасуецца вучоным, работнікам органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў культуры, адукацыі, студэнтам, школьнікам і ўсім, хто займаецца вывучэннем, развіццём і захаваннем духоўных, матэрыяльных каштоўнасцей, навакольнага асяроддзя Беларускага Палесся.

Адказнасць за змест і стыль апублікаваных матэрыялаў нясуць аўтары.

**УДК 930.1 (476) (07)**
**ББК 63.3 (4Беи)**

ISBN 985-473-209-6 (ч. 1)
ISBN 985-473-208-8
© БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2006

*А.М. ВАБІШЧЭВІЧ (Брэст)*

# З РЭЛІГІЙНАГА ЖЫЦЦЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921 – 1939 гг.: СТАНОВІШЧА ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ*

Праваслаўнае насельніцтва Заходняй Беларусі, якая па водле Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. была ўключана ў склад Польшчы, было ахоплена Віленскай, Гродзенскай і Пінскай епархіямі. Там было каля 500 прыходскіх цэркваў, 5 мужчынскіх і жаночых манастыроў, дзейнічала праваслаўная семінарыя ў Вільні, выдавалася рэлігійная літаратура на рускай, беларускай, украінскай і польскай мовах. Уся іх дзейнасць была скіравана на задавальненне духоўных патрэб праваслаўнага люду. Згодна перапісу 1931 г., праваслаўныя складалі 77,6% насельніцтва Палескага ваяводства [1]. Істотнай была іх прысутнасць і ў Віленскім, Навагрудскім, Беластоцкім ваяводствах.

Фармальна культурна-рэлігійныя правы і свабоды праваслаўнага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы гарантаваліся як міжнароднымі абавязацельствамі і ўнутраным заканадаўствам. Малы Версальскі трактат ад 19 чэрвеня 1919 г., Рыжская мірная дамова ад 18 сакавіка 1921 г., канстытуцыі 1921 і 1935 гг. давалі юрыдычныя падставы праваслаўным беларусам, украінцам, рускім для свабоднага выканання рэлігійных абрадаў, утрымання духавенства і царкоўных устаноў. Аднак на практыцы з-за шэрагу прычын гэта ўсё груба парушалася.

Польскі ўрад усяляк спрыяў таму, каб праваслаўная царква вызвалілася ад падпарадкавання Маскоўскаму патрыярхату. 14 чэрвеня 1922 г. на саборы епіскапаў у Варшаве было прынята рашэнне аб аўтакефаліі праваслаўнай царквы ў Польшчы. Супраць гэтага выступілі кіраўнікі ўсіх 3-х заход-

*Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў у межах праекта Г05Р – 027.

небеларускіх епархій. Іх падтрымалі святары, што прыехалі раней з Расіі, частка клірыкаў-беларусаў. Сярод праціўнікаў аўтакефаліі была група беларускіх дзеячаў, «старацаркоўнікаў» – сенатар В. Багдановіч і інш. Пры падтрымцы дзяржаўных уладаў былі разгорнуты ганенні супраць іерархаў праваслаўнай царквы, што не пагаджаліся з аўтакефаліяй. У кастрычніку 1922 г. у Варшаве арыштавалі літоўскага і віленскага архіепіскапа Элеўтэрыя, якога неўзабаве прымусілі выехаць за мяжу. У студзені 1923 г. быў арыштаваны епіскап палескі і пінскі Панцелемон. У кастрычніку 1923 г. пасля арышту быў высланы ў Чэхаславакію епіскап гродзенскі і навагрудскі Уладзімір, а праз год такім жа чынам апынуўся ў Германіі ігумен Жыровіцкага манастыра архімандрыт Ціхан.

Да сярэдзіны 1924 г. амаль усе праціўнікі аўтакефаліі былі пазбаўлены пасад ці апынуліся за мяжой. 13 лістапада 1924 г. канстанцінопальскі патрыярх абвясціў аўтакефалію праваслаўнай царквы ў Польшчы. Афіцыйныя ўрачыстасці з гэтай нагоды адбыліся ў Варшаве 17 верасня 1925 г. Само абвяшчэнне аўтакефаліі было быццам легальным, бо рыхтавалася польскім урадам разам з праваслаўнымі іерархамі [2]. Аднак была наладжана масавая праверка лаяльнасці духавенства. Ваяводскія ўлады былі абавязаны накіроўваць у міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы спісы святароў, якія не падтрымалі аўтакефалію. Да іх прымяняліся розныя рэпрэсіўныя дзеянні. Польскія ўлады імкнуліся трымаць пад кантролем перамяшчэнне праваслаўнага духавенства. У канцы 1922 г. у Палескім ваяводстве было выдадзена распараджэнне, якое забараніла святарам пакідаць межы епархіі без дазволу епіскапа і паведамлення ў староства [3].

Праваслаўная царква так і не атрымала пэўнага прававога статуса. Адносіны з дзяржаўнымі органамі рэгуляваліся «Часовымі правіламі» 1922 г. Толькі 18 лістапада 1938 г. быў падпісаны «Унутраны статут» праваслаўнай царквы ў Польшчы, які амаль поўнасцю падпарадкаваў царкву дзяржаве. Памеры дзяржаўных датацый, адносіны адміністра-

цыйнага апарату былі пастаўлены ў прамую залежнасць ад адабрэння афіцыйнага курса ўладаў.

Ва ўмовах мэтанакіраванай дзяржаўнай падтрымкі выключна рымска-каталіцкага касцёла праваслаўнай царкве было складана вытрымліваць канкурэнцыю з ім. Рэвіндыкацыя (вяртанне былых уніяцкіх і каталіцкіх храмаў) узмацніла матэрыяльныя і ідэалагічныя пазіцыі рымска-каталіцкага касцёла ў Заходняй Беларусі, абцяжарыла становішча праваслаўнай царквы. Першы этап рэвіндыкацыі ў пачатку 1920-х гг. быў найбольш выніковым для католікаў. Праваслаўныя цэрквы адбіраліся пераважна гвалтоўнымі дзеяннямі. Паводле звестак Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы, пасля першай хвалі рэвіндыкацыі з 614 былых уніяцкіх храмаў, што дзейнічалі да першай сусветнай вайны, у праваслаўнай царквы засталіся толькі 350, а з 240 былых каталіцкіх храмаў – толькі 80. Большасць адабраных храмаў перайшла рымска-каталіцкаму касцёлу, іншыя былі закрыты ці знаходзіліся ў занядбаным стане [4].

Шырокамаштабная рэвіндыкацыя ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. суправаджалася масавымі судовымі разбіральніцтвамі. Органы ўлады занялі пазіцыю неўмяшальніцтва ў міжканфесійны канфлікт. У выніку касцёлы захоплівалі нерухомасць пад выглядам вяртання яе былым уладальнікам. У 1929 г. пінскі біскуп З. Лазінскі падаў епархіяльным праваслаўным уладам на Палессі 248 судовых іскаў на перадачу храмаў разам з пабудовамі, зямельнымі надзеламі [5]. Няма статыстыкі адносна таго, колькі з гэтых іскаў было задаволена. Калі меркаваць па агульнапольскіх недакладных і супярэчлівых звестках, то атрымоўваецца значная частка. Апошні этап рэвіндыкацыі разгортваўся ў 1938 – 1939 гг. Адабраныя ў праваслаўных храмы не заўсёды выкарыстоўваліся па прызначэнню, асобныя з іх пуставалі ці былі разбураны. Яскравым прыкладам з’яўлялася знішчэнне ў 1938 г. царквы Аляксандра Неўскага ў Гродна. У ходзе рэвіндыкацыі ў адабраных праваслаўных храмах ламаліся іканастасы, знішчаліся творы скульптуры, дэкаратыўна-прыклад-

нога мастацтва. Назіраліся акты вандалізму адносна праваслаўных могілак. Палітыка рэлігійнай нецярпімасці адносна праваслаўных храмаў вяла да ўзмацнення акаталічвання і апалячвання заходнебеларускага насельніцтва.

Цяжкім было і матэрыяльнае становішча духавенства. У 1926 г. у Палескім ваяводстве 35% праваслаўных святароў жыло ў нястачы, 59% – вельмі сціпла і толькі 6% – у адносным дастатку [6]. У тым жа Палескім ваяводстве дзяржаўныя асігнаванні размяркоўваліся ў залежнасці ад памеру зямельных уладанняў прыходу. Сярэднегадавая матэрыяльная дапамога настаяцелям праваслаўных храмаў вагалася ў залежнасці ад вызначаных 5-ці груп ад 210 да 570 злотых [7].

Польскія ўлады імкнуліся пераўтварыць праваслаўную царкву ў інструмент паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва. Асабліва яскравай стала гэтая тэндэнцыя ў сярэдзіне 1930-х гг. 27 лютага 1937 г. Свяшчэнны Сінод у Варшаве ўвёў практыку ўласнага дазволу польскамоўных набажэнстваў у пэўных храмах. Мясцовая адміністрацыя ўсяляк прыспешвала працэс паланізацыі. У адказ мітрапаліт Дыянісій у сваім лісце ад 7 лістапада 1937 г. звяртаў увагу праваслаўнага духавенства Пінскай епархіі на тое, што старасты не маюць паўнамоцтваў адмяніць распараджэнне Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ад 1 мая 1928 г., якое абавязвала навучаць рэлігіі на роднай мове вучняў. Таксама пацвярджалася, што асноўнай мовай набажэнстваў, абрадаў заставалася царкоўнаславянская мова, а іншыя мовы дапускаліся пры жаданні вернікаў і пасля дазволу Сінода. Казанні і зносіны з людзьмі павінны былі адбывацца на мове, зразумелай большасці вернікаў [8]. Аднак на справе рабілася ўсё наадварот. Палеская духоўная кансісторыя ў наказе благачынным Пінскай епархіі 1 снежня 1937 г. патрабавала навучання рэлігіі па-польску, з выкарыстаннем у асобных выпадках царкоўнаславянскай мовы. Казанні павінны былі праводзіцца і на польскай мове [9].

Першыя богаслужэнні на польскай мове адбыліся 11 лістапада 1935 г. у кафедральным саборы ў Беластоку і гарнізон-

най царкве ў Гродна. Надзвычайны Сінод зацвердзіў пераклады літургічных тэкстаў і дазволіў праводзіць набажэнствы па-польску. Улады інспіравалі рух «праваслаўных палякаў». У 1935 г. у Беластоку было створана Аб'яднанне праваслаўных палякаў імя Ю. Пілсудскага. Аналагічныя таварыствы ўзніклі ў Баранавічах, Ваўкавыску, Валожыне, Гродна, Навагрудку, іншых гарадах. Прыхільнікам паланізацыі царкоўнага жыцця быў гродзенскі епіскап Сава. У канцы 1938 г. у Гродна быў створаны Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут. Асноўнай яго мэтай з'яўлялася «арганізацыя навуковай і выдавецкай дзейнасці для паглыблення і пашырэння прынцыпаў веры, канонаў праваслаўнай царквы, яе арганізацыі і гісторыі» [10]. У студзені 1939 г. згаданая ўстанова пачала выдаваць польскамоўны часопіс «Праваслаўны агляд». Актыўна абгрунтоўвалася ідэя існавання «праваслаўных палякаў», якая не знайшла адназначнай ацэнкі ў тагачаснай грамадскай думцы Польшчы. Пашырэннем польскасці сярод беларускага насельніцтва пачалі займацца маладыя святары, выпускнікі Віленскай семінарыі і тэалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта.

Нягледзячы на гэта, большасць святароў негатыўна ці стрымана рэагавала на планы паланізацыі праваслаўнай царквы. На гэта непасрэдна ўплывалі і настроі мясцовай грамадскасці, асабліва заходнебеларускага сялянства. Варта пагадзіцца з думкай, што ў свядомасці большай часткі вясковага насельніцтва Заходняй Беларусі пачуццё прыналежнасці да праваслаўнай супольнасці часта дамінавала над нацыянальным і палітычным падзеламі [11].

Складанай была барацьба за беларусізацыю праваслаўнай царквы. Сабор епіскапаў у верасні 1924 г. дазволіў карыстацца беларускай мовай «там, дзе гэтага жадаюць вернікі і дазваляюць мясцовыя ўмовы» [12]. Практычна рэалізаваць гэта не ўдалося з-за аб'ектыўных і суб'ектыўных цяжкасцей. Да таго ж польскія ўлады закрылі за радыкальныя пазіцыі часопіс «Праваслаўны беларус» (выдаваўся Я. Пачобкам у лютым-снежні 1925 г.).

Дзеля абароны інтарэсаў заходнебеларускага насельніцтва ў Вільні ў красавіку 1927 г. было створана Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне. У склад яго кіраўніцтва ўваходзілі В. Багдановіч, А. Назарэўскі, А. Коўш і іншыя царкоўныя, грамадскія дзеячы. Гэтая рэлігійная грамадская арганізацыя выдавала ў 1927 – 1928 гг. часопіс «Праваслаўная Беларусь». Яна выступала за беларусізацыю царкоўнага і грамадскага жыцця, супраць нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту беларусаў у Польшчы. Аб'яднанне, што праіснавала прыкладна да 1937 г., падвяргалася вострай крытыцы з боку польскіх шавіністычных дзеячаў і рускіх манархістаў-эмігрантаў.

За прызначэнне святароў-беларусаў, беларусізацыю Віленскай семінарыі і кансісторыі, аб'яднанне праваслаўных беларусаў і з шэрагам іншых патрабаванняў выступаў Беларускі цэнтральны праваслаўны камітэт, што ўзнік пад кіраўніцтвам Т. Вернікоўскага ў сакавіку 1930 г. Пры ім быў заснаваны Саюз беларускай праваслаўнай моладзі. Камітэт неаднаразова дамагаўся ад архіепіскапа віленскага і лідскага шэрагу захадаў у справе беларусізацыі царкоўнага жыцця. Кіраўніцтва арганізацыі выступала за дэрусіфікацыю Віленскай духоўнай семінарыі, стварэнне мясцовых царкоўных камітэтаў, супраць рэвіндыкацыі. Аднак поспехі ў гэтым змаганні былі сціплыя. Пад рэдакцыяй С. Паўловіча быў надрукаваны ў 1933 г. «Праваслаўны малітваслоў» на царкоўнаславянскай і беларускай мовах. У 1935 г. у Вільні была створана камісія па падрыхтоўцы да выдання рэлігійнай літаратуры. Па рэкамендацыі камісіі ў 1936 г. былі надрукаваны па-беларуску ў Варшаве ў сінадальнай друкарні «Свяшчэнная гісторыя Новага Завету» і другое выданне «Першай навукі Закону Божага» С. Паўловіча. Яму належыць таксама аўтарства «Свяшчэннай гісторыі Старога Завету» (1926 г.) і іншых рэлігійных кніг, падручнікаў. Паводле падлікаў Ю. Туронка, сярод 466 беларускамоўных кніг і брашур, выдадзеных у міжваеннай Польшчы, праваслаўная літаратура налічвала ўсяго 6 прац [13]. Тлумачылася гэта не толькі ганеннямі польскіх улад, але і слабой зацікаўленасцю ў выкарыс

танні беларускай мовы з боку пераважнай большасці праваслаўных святароў.

У цэлым, праваслаўная царква на працягу ўсяго акрэсленага перыяду знаходзілася ў складанай ідэалагічнай і палітычнай сітуацыі. Польская дзяржава ўсяляк імкнулася кантраляваць дзейнасць праваслаўнай царквы шляхам наўмысна запаволенага працэсу юрыдычнага афармлення яе статусу, праз датацыі, рэгуляванне кадравага і матэрыяльнага забеспячэння, уцягненне ў правядзенне нацыянальнай палітыкі. Прыярытэтнае становішча рымска-каталіцкай царквы абмяжоўвала паўнацэнную дзейнасць праваслаўнай царквы.

## Літаратура

1. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф.1. – Воп. 2. – Спр. 2019. – Арк. 1.

2. Papierzyńska-Turek M. Między tradycją a rzeczywistością. Państwo wobec prawosławia 1918 – 1939. – Warszawa, 1989. – S. 130.

3. Srokowski K. Sprawy narodowościowe na kresach wschodnich. – Kraków, 1924. – S. 16.

4. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Ф. 93. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 343.

5. Воскресное чтение. – 1931. – № 36. – С. 501.

6. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 2. – Спр. 2203. – Арк. 20.

7. Там жа. – Арк. 17.

8. Там жа. – Ф. 2059. – Воп. 1. – Спр. 12. – Арк. 17.

9. Там жа. – Арк. 12.

10. Statut stowarzyszenia Prawosławny Instytut Naukowo-Wydawniczy. – Grodno, 1938. – S. 2.

11. У новай айчыне: Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд. – Беласток, 2001. – С.22.

12. Праваслаўны беларус. – 1925. – № 1. – С. 5.

13. Turonek E. Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921 – 1939. – Warszawa, 2000. – S. 36.